# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ (IX КЛАС)

2020/2021 навучальны год

Прозвішча, імя, імя па бацьку
вучня_____________________________________________
Прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка

_____________________________________________

**Прачытайце тэкст і выканайце заданні 1-4.**

## Мудры Саламон

Жыў калісьці мудры цар Саламон. Быў ён мудрэйшы за ўсіх людзей. Валадары з далёкіх царстваў прыязджалі да яго, каб паслухаць ягоныя прыпавесці ды павучыцца ў яго розуму.

І пачаў думаць Саламон, што кепска Бог стварыў гэты свет, бо разам з добрым дазволіў жыць і ліхому. І выдаў тады Саламон загад, каб вешалі кожнага, каго зловяць на зладзействе.

Пачуў Бог Саламонавы думкі і зрабіў так, каб той зразумеў сваю памылку. І вось як яно было.

У Саламона расла вельмі прыгожая дачка. Ён надзвычай моцна яе любіў, і чаго б яна (не, ні) папрасіла, (не, ні) ў чым ёй (не, ні) адмаўляў.

*Аднаго дня* папрасіла яна, каб узяў яе з сабой на паляванне.

Упаляваў Саламон са слугамі безліч усялякае дзічыны, нагатавалі яе і пачалі баляваць. Узяла Саламонава дачка кавалак выключна смачнага мяса, але, мабыць, дужа моцна згаладалася на паляванні, бо кавалак той перасеў ёй у горле. Што там (не, ні) рабілі, як (не, ні) ратавалі, а(не, ні) як *не маглі даць рады.* Падавілася Саламонава дачка.

Засмуціўся Саламон (не, ні) вымерна, кінуў баляваць дый павёз хаваць сваю любую дачушку.

Прыбралі яе ў золата і дарагое адзенне, а сам Саламон павязаў ёй на шыю дыямантавыя пацеркі, ды такія, якіх свет (не, ні) бачыў.

А *адзін* зламыснік агледзеў тое золата з дыямантамі і надумаўся скрасці.

Як пахавалі Саламонаву дачку, засыпалі зямлёю і разышліся з могілак, дык той злодзей досыць хуценька раскапаў магілу, выцягнуў дамавіну і *хацеў быў адчыніць* вечка, але не мог, як (не, ні) стараўся. Тады вывернуў ён надмагільны камень і рэзнуў ім па труне *так,* што яна адчынілася.

Бачыць ён, *ажно* Саламонава дачка ажыла і падымаецца з труны. Мабыць, як ударыў ён тым каменем, дык мяса ў горле праскочыла і царэўна ажыла. (Не, ні) ведала яна, што з ёю робіцца і чаго ляжыць у той скрыні, але гукнула таго злодзея. А той так перапалохаўся, што не мог варухнуцца і стаяў, быццам каменны слуп.

На крык збегліся людзі, забралі царэўну, схапілі злодзея і прывялі да Саламона.

Узрадаваўся той, што дачка ажыла, а як даведаўся, што выратаваў яе злодзей, дык засмуціўся.

Зразумеў Саламон, што (не, ні) яму вучыць Бога, бо той (не, ні) здарма зрабіў так, што часам і занадта ліхое творыць занадта добрае.

*Пераказаў У Сіўчыкаў.*

**Заданне 1.**
а) Вызначце стыль і тып тэксту;
б) Запішыце ўстойлівы выраз, які змяшчае ў сабе імя Саламона, і патлумачце яго значэнне.

**Стыль**_______________________________________
**Тып**_________________________________________
**Устойлівы выраз:** ___________________________
**Тлумачэнне:** ________________________________

**Заданне** *2.* Выпішыце з тэксту 6 прыслоўяў меры і ступені.

**Заданне 3.** Звярніце ўвагу на словы, дзе неабходна выбраць напісанне *не* ці *ні.* У тэксце такія выпадкі пазначаны наступным чынам: *(не, ні).* Выпішыце словы з *не* і *ні* асобна.

| **не** | **ні** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

**Заданне 4.** Вызначце, якую сінтаксічную ролю выконваюць вылучаныя курсівам словы і спалучэнні слоў.

| **Вылучаныя словы** | **Сінтаксічная роля** |
|---|---|
| аднаго дня | |
| не маглі даць рады | |
| толькі | |
| хацеў быў адчыніць | |
| так | |
| ажно | |

**Заданне 5.** Уважліва прачытайце прыклады. Вызначце ў кожным радку, дзе трэба напісаць *вялікую* літару (у першым выпадку, у другім выпадку _ці ў

абодвух), ці патрэбна *двукоссе* ў гэтым радку, патрэбны *дэфіс* у гэтым радку. Пастаўце знак плюс (+)- у адпаведным слупку. Улічыце, што кожны з прыкладаў знаходзіцца не ў пачатку сказа.

***Табліца да задання 5.***

| ***Прыклады*** | ***Вялікая літара пішацца ў першым выпадку*** | ***Вялікая літара пішацца ў другім выпадку*** | ***Ставіцца двукоссе*** | ***Ставіцца дэфіс*** |
|---|---|---|---|---|
| ***(А, а)дысеевы падарожжы*** | | | | |
| ***медаль (З, з)а (А, а)двагу - пачэсная ўзнагарода*** | | | | |
| ***(М, м)агеланаў (П, п)раліў*** | | | | |
| ***Леанарда (Д, д)а (В, в)інчы*** | | | | |
| ***Нью (Ё, ё)рк*** | | | | |
| ***(Б, б)ікфордаў шнур*** | | | | |
| ***магутнасць лямпачкі - чатыры (В, в)аты*** | | | | |
| ***(Д, д)зень (Н, н)езалежнасці*** | | | | |

***Табліца да задання 6.***

| | | |
|---|---|---|
| вiламi па вадзе... | 'невядома, ці ажыццявіцца што-н. (пра няпэўнае, маламагчымае)' | |
| ... скiба | 1) 'той, хто аддзяліўся ад сям'і, стаў самастойным, не патрабуе клопатаў'; 2) 'той, хто парваў сувязі з прывычным асяроддзем, спосабам жыцця, з прывычнай дзейнасцю' | |
| як мыла ... | 'з незадаволеным, кіслым выглядам, у дрэнным настроі (пайсці, сядзець, быць і пад.)' | |
| ... залатымi лiтарамi | 'захаваецца ў памяці людзей як выдатная з'ява чаго-н.' | |
| з... дыханнем [слухаць] | 'вельмі ўважліва, зацікаўлена' | |
| [насіцца] як <дурань> з ... торбай | 'незаслужана ўдзяляючы шмат увагі каму-, чаму-н.' | |

***Заданне 6.*** Аднавіце прапушчаныя кампаненты прыведзеных у левым слупку табліцы фразеалагізмаў паводле сфармуляваных значэнняў і запішыце гэтыя кампаненты ў правым слупку ў адпаведных радках.
*Падказка*: прапушчаныя кампаненты - дзеепрыметнік або дзеепрыслоўе.

***Заданне 7.*** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Позади него, прижавшись к стене, стоял совершенно незнакомый человек. На незнакомце был плащ из тусклого серого бархата с вышитым по краю узором из золотых снежинок. На голове шляпа с павлиньим пером, падавшим на плечо. Перо заканчивалось ярким зелёно-синим переливчатым пятнышком, чем-то напоминавшим широко раскрытый глаз. Тут волшебник Алеша даже несколько растерялся: этот глаз на конце пера смотрел на него пристально и неотрывно (По С. Прокофьевой).

________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________

***Заданне 8.*** Рашыце красворд.

*Па вертыкалі:* 1. Трохскладовая стапа з націскам на першым складзе.(7) 3. Трохскладовая стапа з націскам на трэцім складзе.(7) 5. Род літаратуры, які адлюстроўвае рэчаіснасць праз суб’ектыўнае выяўленне пачуццяў, перажыванняў аўтара.(6) 6. Ужыванне слова ў пераносным значэнні для ўзмацнення вобразнасці моўнага .афармлення твора (напрыклад, метафара, эпітэт і інш.). (4) 7. Трохскладовая стапа з націскам на лругім складзе.(10) 12. Слова, радок ці некалькі радкоў, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы верша.(6)

*Па гарызанталі:* 2. Група аб’яднаных рыфмоўкай вершаваных радкоў, якая паўтараецца на працягу твора.(7) 4. Парушэнне прамога парадку слоў з мэтай вылучэння галоўнага.(8) 8. Сугучнасцьканчаткаў вершаваных радкоў.(5) 9. Перыядычны паўтор асобных элементаў тэксту праз пэўныя прамежкі. Напрыклад, чаргаванне націскных і ненаціскных складоў у сілаба-танічным вершы.(4) 10. Двухскладовая стапа з націскам на другім складзе.(3) 11. Двухскладовая стапа з націскам на першым складзе.(5)

**Па вертыкалі**: 1. ___________ 3. _____________ 5. _____________ 6. _______________
7. _______________ 12. ________________
***Па гарызанталі: 2.*** ________________ ***4.*** ______________ ***8.*** ______________ ***9.*** _____________
***10.*** ________________ ***11.*** ________________

***Заданне 9.*** Па апісанні пазнайце персанажаў, назавіце творы, у якіх яны дзейнічаюць, і аўтараў гэтых твораў.

**А**. Моцны малады чалавек, які з-за нешчаслівага кахання стаў злодзеем. Быў забіты сваёй каханкай. На яго магіле была насыпана вялікая тара.
**Б**. Хлопчык, які меў некалькі мянушак. Добра вучыўся ў польскай школе, праз беднасць не мог пайсці ў чацвёрты клас, але дапамог дзядзька Пятрусь, што даў грошы. Хлопчыку падабалася выхавацелька чацвёртага класа, бо размаўляла на беларускай мове.
**В**. Немаладая жанчына, удава палясоўшчыка, якая прыйшла ў горад пабачыць свайго сына, але атрымала не цёплы прыём, а некалькі трохрублёвых паперак.

| Апісанне | Персанаж | Назва твора | Аўтар твора |
|---|---|---|---|
| А. | | | |
| Б. | | | |
| В. | | | |

**Заданне 10**. Прачытайце вершаваны твор "Малпін жарт" Уладзіміра Корбана і запоўніце табліцу.

| | |
|---|---|
| 1. Да якога літаратурнага роду ці міжродавага ўтварэння адносіцца твор? | |
| 2. Жанр твора | |
| 3. Які(я) алегарычны(я) вобраз(ы) выкарыстаны ўтворы? | |
| 4. Прыкладам якога сродку мастацкай выразнасці з'яўляецца падкрэслены фрагмент тэксту? | |
| 5. Як называецца вылучаны курсівам фрагмент твора? | |
| 6. Адным сказам абгрунтуйце, чаму гэты твор з'яўляецца сатырычным | |

Пасля начной адказнае работы
Трэзор і Мурза спалі каля плота.
Тым часам Малпа не драмала,
Убачыўшы сабак, цішком
Падкралася да іх і матузком
Хвасты звязала.
Сама ж схавалася за вугал і глядзіць,
Каменьчыкамі кідзь ды кідзь, -
Стараецца іх пабудзіць.
Што тут было, калі прачнуліся абое! -
Трэзора Мурза рве, а Мурзу рве Трэзор!
Умомант гырканне ўзнялі такое, -
Ажно гудзе ўвесь двор.
А Малпа ледзьве не кладзецца, -
І скача, і крыўляецца, й смяецца,

Сабачы бой

*І рукі паціраюць.*

Так па душы прыйшоўся ёй.
Нарэшце развязаліся хвасты,
Сабакі сціхлі, раны залізалі,
Агледзеліся і затым

На Малпу, скеміўшы, напалі,
Што з той ажно пасыпалася поўсць.

*І між людзьмі такія ёсць:*
*Звядуць дваіх, наладзяць склоку*,
А потым збоку
На цяганіну пазіраюць

**ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ**
**Калі б я мог**

З чаго пачаць? Нялёгка гэта,
Каб хоць і сотні год я жыў,
Калі б я мог - усю планету
На лепшы лад перарабіў.

Пяскі пустэльняў, дзе жывое
Было няведама калі,
Я б спалучаў найлепш з вадою,
Здружыў, каб сёстрамі жылі.

Я да пяскоў (такія планы,
Каб там расло, каб там цвіло)
Прывёў бы частку акіянаў,
Глядзіш, пяскоў бы не было.

А што далей?.. Задуме згодна,
Я, як і справу пачынаў,
Дык шмат народаў там выгодна,
Без крыўды б скрозь парассяляў.

Мне кажуць: - Быць рэальным раім.
За гэта ўзяўся ты не ў час!
Ах, мары, мары! Шмат іх маем...
Мо рэчаіснасць дасць адказ?

Пятрусь Броўка (1979).

***ДАВЕДКІ*** ***Задание 1.***

Стыль мастацкі.
Тып апавяданне.
Саламонава рашэнне - мудрае рашэнне складанага пытання (паводле біблейскага падання. Саламон мудра рассудзіў дзвюх жанчын, якія спрачаліся за дзіця).
Каментар. За правільнае вызначэнне стылю - 1 бал, за правільнае вызначэнне тыпу - 1 бал, за правільнае вызначэнне ўстойлівага выразу - 1 бал, за правільнае тлумачэнне ўстойлівага выразу - 1 бал.
***Задание 2.***
Вельмі, надзвычай, выключна, дужа, досыць, занадта.
Каментар. За кожны правільны адказ - 1 бал
**Задание 3.**
Не: не адмаўляў, невымерна, не бачыў, не ведала, не яму вучыць Бога, нездарма.

***Табліца да задання 5***

| ***Прыклады*** | ***Вялікая літара пішацца ў першым выпадку*** | ***Вялікая літара пішацца ў другім выпадку*** | ***Ставіцца двукоссе*** | ***Ставіцца дэфіс*** |
|---|---|---|---|---|
| ***(А, а)дысееў падарожжы*** | + | | | |
| ***медаль (З, з)а (А, а)двагу - пачэсная ўзнагарода*** | + | | + | |
| ***(М, м)агеланаў (П, п)раліў*** | + | | | |
| ***Леанарда (Д, д)а (В, в)інчы*** | | + | | |
| ***Нью (Ё, ё)рк*** | + | | | + |
| ***(Б, б)ікфордаў шнур*** | | | | |
| ***магутнасць лямпачкі - чатыры (В, в)аты*** | | | | |
| ***(Д, д)зень (Н, н)езалежнасці*** | + | + | | |

***Табліца да задання 6***

| | | |
|---|---|---|
| ***віламі па вадзе...*** | ***'невядома, ці ажыццявіцца што-н. (пра няпэўнае, маламагчымае)'*** | пісана |
| ***... скіба*** | ***1) 'той, хто аддзяліўся ад сям'і, стаў самастойным, не патрабуе клопатаў'; 2) 'той, хто парваў сувязі з прывычным асяроддзем, спосабам жыцця, з прывычнай дзейнасцю'*** | адрэзаная |
| ***як мыла ...*** | ***'з незадаволеным, кіслым выглядам, у дрэнным настроі (пайсці, сядзець, быць і пад.)'*** | з'еўшы |
| ***... залатымі літарамі*** | ***'захаваецца ў памяці людзей як выдатная з'ява чаго-н.'*** | упісана |
| ***з... дыханнем [слухаць]*** | ***'вельмі ўважліва, зацікаўлена'*** | затоеным |
| ***[насіцца] як <дурань> з ... торбай*** | ***'незаслужана ўдзяляючы шмат увагі каму-, чаму-н.'*** | пісанай |

*Ні:* чаго б яна ні папрасіла, ні ў чым, што там ні рабілі, як ні ратавалі, аніяк, як ні стараўся.
***Каментар.*** За кожны правільны адказ - 0,5 бала.
**Задание 4.**

| Вылучаныя словы | Сінтаксічная роля |
|---|---|
| аднаго дня | *акалічнасць часу* |
| не маглі даць рады | *састаўны дзеяслоўны выказнік* |
| адзін | *дапасаванае азначэнне* |
| хацеў быў адчыніць | *просты дзеяслоўны выказнік (даўномі- нулае дзеянне)* |
| ажно | *не выконвае сінтаксічнай ролі (часціца)* |
| так | *акалічнасць спосабу дзеяння* |

***Каментар.*** За кожны правільна запоўнены радок - 1 бал.
**Задание 5.**
***Каментар.*** За кожны правільна запоўнены радок - 1 бал.
**Задание 6.**
***Каментар.*** За кожны правільны адказ - 1 бал.
**Задание 7.**
*Прыкладны варыянт перакладу:*

Ззаду яго *(за / па-за ім),* прыцiснуўшыся да сцяны, стаяў зусiм незнаёмы чалавек. На незнаёмцу быў плашч з цьмянага шэрага аксамiту з вышытым па краi ўзорам з залатых сняжынак. На галаве капялюш з паўлiнавым пяром, якое падала на плячо. Пяро канчалася *(заканчвалася)* яркай зялёна-сiняй пералiвiстай плямкай, якая чымсьцi *(нечым)* нагадвала шырока расплюшчанае (*раскрытае*) вока. Тут чараўнiк Алёша нават трохi *(крыху, некалькі)* разгубiўся: гэта(е) вока на канцы пяра глядзела (*ўглядалася)* на яго пiльна i неадрыўна.

***Каментар.*** За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.
**Задание 8.**
**Па вертыкалі: 1.** *Дактыль.* **3.** *Анапест.* **5.** *Лірыка.* **6.** *Троп.* **7.** *Амфібрахій.* **12.** *Рэфрэн.*
**Па гарызанталі: 2.** *Страфа.* **4.** *Інверсія.* **8.** *Рыф- ма.* **9.** *Рытм.* **10.** *Ямб.* **11.** *Харэй.*
***Каментар.*** За кожны правільны адказ - 0,5 бала.
**Задание 9.**

| Апісанне | Персанаж | Назва твора | Аўтар твора |
|---|---|---|---|
| А. | *Машэка* | *"Магілальва"* | *Янка Купала* |
| Б. | *Данік Малец* | *"Сірочы хлеб" ("Урокі пані Мар'і")* | *Янка Брыль* |
| В. | *Тэкля (маці Лаўрука)* | *"На Каляды к сыну"* | *Змітрок Бядуля* |

***Каментар.*** За кожнага правільна названага персанажа - 1 бал, за правільна названы твор - 0,5 бала, за правільна вызначанага аўтара - 0,5 бала.
**Задание 10.**

| | |
|---|---|
| *1.* Да якога літаратурнага роду ці міжродавага ўтварэння адносіцца твор? | Ліра-эпас |
| 2. Жанр твора | Байка |
| 3. Які(я) алегарычны(я) вобраз(ы) выкарыстаны ў творы? | *Сабакі (Мурза, Трэзор) і Малпа* (правільным лічыцца поўны адказ, указание толькі на адзін вобраз лічыцца правільным часткова) |
| 4. Прыкладам якога сродку мастацкай выразнасці з'яўляецца падкрэслены фрагмент тэксту? | *Гіпербала / метафара / метанімія* (магчымы адзін або некалькі варыянтаў адказу) |

| | |
|---|---|
| 5. Як называецца вылучаны курсівам фрагмент твора? | Мараль |
| 6. Адным сказам абгрунтуйце, чаму гэты твор з'яўляецца сатырычным | *Праз смех выкрываюцца грамадскія заганы* (магчымы іншыя адказы пры захаванні сутнасці) |

***Каментар.*** За кожны правільны адказ - 1 бал, за часткова правільны - 0,5 бала.